1. УДК (номер тематической рубрики): 94(474.5)
2. Сведения об авторе

| № п/п | Наименование | На русском языке | На белорусском языке | На английском языке |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Фамилия, имя, отчество автора | Николаева Людмила Виторовна | Мікалаева Людміла Віктараўна | Liudmila V. Mikalayeva |
| 2 | Место работы или учебы, должность, степень, звание автора | Учреждение образования «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники», заведующий кафедрой гуманитарных дисциплин, кандидат исторических наук, доцент | Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі”, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін, кандыдат гістарычных навук, дацэнт | Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, head of the department of humanities, Candidate of Historical Sciences, Associate Professor |
| 3 | Почтовый индекс, адрес места работы или учебы, город страна | 220013, ул. П. Бровки, 6, Минск, Беларусь | 220013, вул. П. Броўкі, 6, Мінск, Беларусь | 220013 6 P. Brovki Street, Minsk, Belarus |
| 4 | Электронный адрес | Mikalayeva@bsuir.by | | |

3. Название статьи (на русск.): Особенности трактата Михалона Литвина «О нравах татар, литовцев и москвитян» как источника по истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – середине XVI в.

Название статьи (на белорусск.): Асаблівасці трактата Міхалона Літвіна “Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў” як крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.

Название статьи (на англ.): Features of the treatise Michalon Lytvyn “About morals of Tatars, Lithuanians and Muscvityan” as a source for the history of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania in the late XIV – the middle of the XVI century.

4 Резюме: Целью статьи “Особенности трактата Міхалона Литвина “О нравах татар, литвинов и московитов” как источника по истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – середине XVI в.” является характеристика возможности использования содержания трактата для

Библиотека БГУИР

исследования именно проблематики внешнеполитического характера. Методологической базой исследования стали общенаучные (аналитический, синтетический, логический), исторический (историко-сравнительный), источниковедческий (историко-критический) методы. В статье рассматривается научная дискуссия по вопросу о возможном авторе трактата “О нравах татар, литвинов и московитов”, который выступил под псевдонимом М. Литвин. Поддерживается мнение Е. Ахманьскага о Венцеславе Николаевиче, как наиболее вероятном авторе произведения. Анализируется содержание текста десяти сохранившихся частей трактата с точки зрения возможности использования их данных для исследования истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – середине XVI в. Констатируется наличие в тексте трактата ряда уникальных сообщений, которые не встречаются в других источниках. Акцентируется внимание на том, что трактат содержит много сведений по истории взаимоотношений Великого Княжества Литовского с Крымским ханством и некоторыми другими татарскими ордами. Обращается внимание на информацию по истории взаимоотношений Великого Княжества Литовского с Великим Княжеством Московским. Делается вывод о возможности использования материалов трактата в качестве интересного аутентичного источника по истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – середине XVI в.

Рэзюмэ: Мэтай артыкула “Асаблівасці трактата Міхалона Літвіна “Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў” як крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.” з’яўляецца характарыстыка магчымасці выкарыстання зместу трактата для даследавання менавіта праблематыкі знешнепалітычнага характару. Метадалагічнай базай даседавання сталі агульнанавуковыя (аналітычны, сінтэтычны, лагічны), гістарычны (гісторыка-параўнаўчы), крыніцазнаўчы (гісторыка-крытычны) метады. У артыкуле разглядаецца навуковая дыскусія па пытанні аб магчымым аўтары трактата “Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў”, які выступіў пад псеўданімам М. Літвін. Падтрымліваецца меркаванне Е. Ахманьскага аб Венцаславе Мікалаевічы, як найбольш верагодным аўтары твора. Аналізуецца змест тэксту захаваўшыхся дзесяці частак трактата з пункта гледжання магчымасці выкарыстання іх звестак для даследавання гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. Канстатуецца наяўнасць у

Библиотека БГУИР

тэксце трактата шэрагу ўнікальных паведамленняў, якія не сустракаюцца больш у іншых крыніцах. Акцэнтуецца ўвага на тым, што трактат утрымлівае шмат звестак па гісторыі ўзаемаадносін Вялікага Княства Літоўскага з Крымскім ханствам і некаторымі іншымі татарскімі ордамі. Звяртаецца ўвага на інфармацыю па гісторыі узаемаадносін Вялікага Княства Літоўскага з Вялікім Княствам Маскоўскім. Робіцца выснова аб магчымасці выкарыстання матэрыялаў трактата ў якасці цікавай аўтэнтычнай крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.

Abstract: The purpose of the article article “Features of the treatise Michalon Lytvyn “About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan” as a source for the history of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania in the late XIV – the middle of the XVI century" is the characteristic of the possibility of the use of its contents for the study exactly of foreign policy issues. A methodological base of research were general scientific (analytical, synthetic, logical), historical (historical -comparative), source study (the historical-critical) methods. The article discusses the scientific debate about the possible the author of the treatise " About morals of Tatars, Lithuanians and Moskvityan", who spoke under the pseudonym M. Lytvyn. Is supported the opinion of J. Ohman’skogo about Ventsaslave Nikolayevich, as the most probable author of the work. Analyzed the content of the text ten surviving parts of the treatise from the standpoint of the ability to use their data for the study of the history of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of XIV – in the middle of the XVI century. Noted the presence in the text of the treatise of the number of unique messages that are not found in other sources. Focuses on the fact that the treatise contains a lot of information on the history of relations between the Great Duchy of Lithuania with the Crimean khanate and some other Tatar hordes. Attention is drawn to the information on the history of relations between the Great Duchy of Lithuania the Grand Duchy of Moscow. Is drawn the conclusion about the possibility of using materials of the treatise as interesting authentic source on the history of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of XIV – the middle of the XVI century.

5. Ключевые слова: источники, внешняя политика, Великое Княжество Литовское, исследование.

Ключавыя словы: крыніцы, знешняя палітыка, Вялікае Княства Літоўскае, даследаванне.

Keywords: sources, foreign policy, the Grand Duchy of Lithuania, a study.

Библиотека БГУИР

У ліку наратыўных крыніц, створаных у сярэдзіне XVI ст., якія могуць быць прыцягнуты для даследавання знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., некалькі асабняком стаіць трактат Міхалона Літвіна “Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў”. Даследчыкі маюць магчымасць выкарыстоўваць толькі 10 вялікіх фрагментаў твора, якія былі выдадзеныя на лацінскай мове ў 1615 г. у Базелі (Швейцарыя) І.Я. Грасерам у друкарні К. Вальдкірха [1]. Лёс поўнага тэкста трактата невядомы. У XIX ст. былі зроблены два пераклады захаваных частак трактата М. Літвіна на рускую мову [2; 3]. Факсіміле першага выдання і пераклад на літоўскую мову І. Йонінаса пабачылі свет у Вільні ў 1966 г. [4]. Навейшае выданне рускамоўнага перакладу тэкста фрагментаў з каментарыямі выйшла ў Маскве ў 1994 г. [5]. Яго мы выкарысталі пры напісанні дадзенага артыкула.

Трактат быў напісаны да 1550 г., калі ён ужо быў прадстаўлены Жыгімонту II Аўгусту (у ВКЛ Жыгімонт III Аўгуст) (1520 – 1572) каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму [1548 – 1572, фармальна з 1529] [5, с 61].

Сапраўднае імя аўтара трактата даўга заставалася прадметам дыскусіі. У дарэвалюцыйнай расійскай, а потым і савецкай гістарыяграфіі аўтарам лічыўся Міхаіл Тышкевіч, дзяржаўны дзеяч і дыпламат, праваслаўны па веравызнанні, удзельнік пасольства ў Крым у 1538 г. [6, с. 87]. Упершыню гэта гіпотэза была прапанавана В.Б. Антановічам [7, с. 5 – 6]. Яна была падтрымана і развіта аўтарытэтным даследчыкам гісторыі ВКЛ М.К. Любаўскім [8, с. 49 – 54]. Нягледзячы на крытыку такога меркавання, выказаную І.І. Лапа, які звярнуў увагу на несупадзенне некаторых характарыстык асобы аўтара тэкста і мяркуемага кандыдата (першы – літовец, католік, які ўспрымаў ідэі Рэфармацыі, другі – праваслаўны русін) [9, с. 333], версія замацавалася. З аўтарствам М. Тышкевіча, пагаджаўся і літоўскі даследчык І. Йонінас [6, с. 87]. Між тым, апошні лічыў, што аўтарам трактата мог быць і Мікіфар Грынька Лавейкавіч па мянушцы Міхайла [10, с. 14]. Ажыццёўленая І. Йонінасам літоўская публікацыя трактата ўмацавала пазіцыі гіпотэзы М.К. Любаўскага [4]. З ёй пагаджаўся і Ю.М. Юргініс [6, с. 87 – 96]. Беларускі даследчык С.Ф. Сокал часткова разгарнуў высновы М.К. Любаўскага і залічыў М. Літвіна да прадстаўнікоў гуманістычный думкі Беларусі [11, с. 35 – 63; 12, с. 199 – 204]. Новое меркаванне з'явілася, калі ў канцы 1970-х гг. польскі гісторык Е. Ахманьскі на аснове комплекса прыкмет, што характарызавалі аўтара, а таксама сведчанняў іншых крыніц, пераканаўча даказаў, што аўтарам трактата мог быць толькі Венцаслаў (Венцлаў) Мікалаевіч (каля 1490 – 1560 гг.), літовец,

Библиотека БГУИР

католік, лацінскі сакратар вялікакняжацкай канцылярыі ў 1534 – 1542, 1547 – 1556 гг., удзельнік некалькіх дыпламатычных місій, у тым ліку ў Крым (у 1542 – 1543 гг.) і Маскву [13, с. 97 – 117]. На наш погляд, лагічныя і абгрунтаваныя доказы Е. Ахманьскага з'яўляюцца найбольш прымальнымі.

Трактат – палемічны твор. Але знаходжанне яго аўтара ў Крыме і апісанне ўбачанага там дазваляе дазглядаць маючыяся часткі трактата як крыніцу па вывучэнні ўзаемаадносінаў ВКЛ з Крымскім ханствам у першай палове XVI ст. Акрамя таго, у творы ўтрымліваюцца і звесткі па іншых аспектах, адносных да сферы знешняй палітыкі ВКЛ.

У першам фрагменце М. Літвін прыводзіць звесткі пра падзел татарскага свету на орды, адзначаючы найбольшую небяспечнасць для ВКЛ самых слабых, але бліжэй за іншых дыслакаваных перакопскіх татар, г.зн. Крымскага ханства [5, с. 62]. Аўтар трактата прыводзіць звесткі па гісторыі Крыма і дынастыі Гірэяў, заснавальнік якой Хаджы-Гірэй (Ачкирей), па легендзе, сам нарадзіўся ў ВКЛ, а потым пры дапамозе вялікага князя Вітаўта стаў ханам у Крыме. А яго нашчадкі прыносяць клопаты наступнікам Вітаўта [5, с. 64 – 65].

Інфармацыя, прыведзеная аўтарам трактата, мела стратэгічнае значэнне для магчымых ваенных выправаў войскаў ВКЛ на Крым. Ён звяртае ўвагу на арганізацыю ваеннай справы і ўзаемаадносіны татараў і турак з хрысціянскім насельніцтвам Крыма. Па яго звестках, хан мае магчымасць сабраць войска колькасцю каля 30000 коннікаў [5, с. 65].

Апісваючы адпраўку татарскіх войск на дапамогу туркам у выправе на Венгрыю, якая магла мець месца ў 1543 г. [13, с. 105], М. Літвін звярнуў увагу на беднае ўзбраенне татараў, якія, аднак, заўсёды бралі з сабой шмат коней, да пяці запасных на аднаго конніка. Апошняе дазваляла павялічыць хуткасць і мабільнасць перасоўвання. Адсутнасць абоза таксама павялічвала іх рухомаць. Важнай мэтай набегаў татараў быў захоп людей для прадажы. У баі яны звычайна акружалі праціўніка з левага фланга, што рабіла больш зручнай стральбу з лука. Татары часта выкарыстоўвалі тактыку падману і засад. Без уловак і хітрасці яны часта саступалі значна меншаму войску [5, с. 66]. У якасці прыкладу М. Літвін прыводзіць бітву на р. Альшаніцы 5 лютага 1527 г., дзе, па яго звестках, войску праціўніка, страты якога склалі 25 тысяч чалавек, супрацьстаяла 3,5-тысячнае войска ВКЛ, якое ў выніку перамагло. Такія звесткі аб суадносінах сіл паведамляе толькі М. Літвін. У бітве ж пад Клецкам загінула 27 тысяч татараў, разбітых 9-цю тысячамі воінаў ВКЛ [5, с. 67].

Библиотека БГУИР

М. Літвін звярнуў увагу, што татары падбіраюць для бітваў стратэгічна выгадныя месцы. Так было каля Сокаля, дзе войска ВКЛ пацярпела паражэнне, бо ў разбураным горадзе хутка рухацца было немагчыма. З-за стратэгічнага пралiку была прайграна і бітва з Іслам-Сустанам ля Ачакава, нягледзячы на колькасную перавагу войска ВКЛ. Яно было разбіта у той час, калі яго кіраўнікі знаходзіліся на перамовах з татарамі [5, с. 67 – 68].

У другім фрагменце М. Літвін паведамляе пра штогадовыя “ўпамінкі” татарам, якія прысылае ім кіраўніцтва ВКЛ, як сябрам-саюзнікам [5, с. 75].

У трэцім фрагменце аўтар трактата наракае на тое, што ўсходні сусед ужо захапіў 73 крэпасці ВКЛ [5, с. 76]. Ён не пагаджаецца з тым, што заволжскія і перакопскія татары называюць князя масквіцян сваім халопам, бо ад іх верхавенства пазбавіўся яшчэ Іван III. Апошні, скарыстаўшыся занятасцю караля і вялікага князя Казіміра вайной у Прусіі, далучыў да своёй вотчыны літоўскія, як лічыць аўтар, землі: Ноўгарад, Пскоў, Севершчыну [5, с. 77 – 79]. А яго сын Васіль далучыў Смаленск, хітрасцю заняты М. Глінскім [5, с. 79]. М. Літвін робіць выпад і ў адрас цара Івана IV, які хоць і аддаў ВКЛ Гомель, пабудаваў на захопленых землях тры крэпасці: Себеж, Веліж, Завалочча. На думку аўтара, маскоўскі правіцель ва усім бярэ прыклад са слаўнага вялікага князя літоўскага Вітаўта, якім М.Літвін адкрыта захапляецца [5, с. 80, 85].

У пятым фрагменце М. Літвін падкрэслівае, што літвінам належыць вядучая роля ў вызваленні рускага насельніцтва ад татарскага ярма [5, с. 87]. Ён паведамляе, што Міндоўг не толькі быў ахрышчаны, але і прыняў каралеўскую карону. М. Літвін ганарыўся хрышчэннем Літвы ў 1386 г. каралём і вялікі князем Уладзіславам Ягайлам і аб’яднаннем польскага і літвінскага народа пад яго кіраўніцтвам [5, с. 88].

У восьмым фрагменце аўтар захапляецца слаўным ваенным мінулым ВКЛ у часы Гедзіміна і Вітаўта [5, с. 91], паходамі на Маскву. Ён прапановае адмовіцца ад наёмных войск падчас ваенных кампаній. Пры гэтым аўтар прыводзіць прыклад караля Венгрыі Людовіка, пакінутага наёмнікамі падчас бітвы, пасля чаго той быў затаптаны падчас уцёкаў. Успамінае ён і Казіміра Ягелончыка, якога падчас бітвы ля Хойніцэ выратавалі добраахвотнікі з ВКЛ [5, с. 93].

У дзевятым фрагменце ўтрымліваюцца звесткі пра арганізацыю дыпламатычнай службы ў ВКЛ. М. Літвін сцвярджаў, што на яго радзіме, калі пасылалі каго-небудзь па дзяржаўнай службе, то той, нават калі яшчэ не заслужыў, атрымліваў грошы са скарбу ў неабходнай колькаці, хатя многія

Библиотека БГУИР

вярталіся, нічога не зрабіўшы [5, с. 94]. Канцылярыя ВКЛ выдае вельмі шмат дазволаў на падводы, а нядаўна ад абавязкаў пастою вызвалілі тых, хто ў свой час атрымаў маёнткі ля дарог да зямель масквіцян, татар і турак, пры ўмове, што будуць выконваць гэту павіннасць [5, с. 95]. Аўтар трактата абвінавачвае ў страце северскіх крэпасцей князёў-перабежчыкаў С. Мажайскага і В. Шамячыча. М. Літвін таксама паведамляе пра дзейнасць маскоўскіх шпегаў. Так, па яго звестках, нейкі маскоўскі святар тайна пранік у гаспадарскую канцылярыю і здабываў там копіі дагавароў, распараджэнняў і матэрыялы нарад, якія пасылыў свайму валадару. М. Літвін шкадуе пра 300 трафейных сцягоў, страчаных у выніку пажару ў віленскім касцёле Святога Станіслава, у тым ліку 12, здабытых 8 верасня 1514 г. у бітве пад Оршай, падчас якой было забіта і захоплена ў палон 80 тысяч ваяроў праціўніка. М. Літвін дэманструе і знаемства з палітычным жыццём за мяжой, паколькі ведае, што ў лівонцаў з Масквой вечны мір (па сутнасці – перамір’е 1503 г.) і добрасуседскія адносіны [5, с. 96]. Ён пералічвае дзевяць пераправаў праз Днепр і раіць паставіць там хаця б невялікія атрады, каб перакрыць шлях татарам [5, с. 99]. Для гэтай мэты можна было б выкарыстаць казакаў [5, с. 100 – 101]. М. Літвін падрабязна апісвае Кіеў, якім марыць авалодаць князь масквіцян, спасылаючыся на тое, што ён – нашчадак кіеўскага князя Уладзіміра [5, с. 101].

Такім чынам, трактат М. Літвіна “Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў” належыць да ліку важных наратыўных крыніц па гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ з Крымскім ханствам і шэрагам іншых татарскіх орд, інфармацыя аб чым найбольш прадстаўдена ў творы. У ім таксама маюцца цікавыя звесткі аб стасунках ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім. Трактат утрымлівае часам унікальныя звесткі аб падзеях знешнепалітычнага характару, дае іх ацэнку з пункта гледжання сучаснікаў аўтара твора, па-свойму тлумачыць прычыны ваенных няўдач ВКЛ і з’яўляецца цікавай аўтэнтычнай крыніцай.

Библиотека БГУИР

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Michalonis Lituani De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum fragmina X multiplici historia referta et Johannis Lasicii Poloni De diis samagitarum, caeterorumque sarmatarum et falsorum christianorum. Item de religione armeriorum et de initio regiminis Stephani Batorii. Nunc primum per I. Jac. Grasserum, C. P. ex manuscript authentice edita. Basilieae apud Conradum Waldkirchium, MDCXV. P. 1 – 41.

2. Литвин М. Десять отрывков разнообразного исторического содержания (из сочинения) Михалона Литвина «О нравах татар, литовцев и москвитян» // 1) Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Н. Калачовым. М., 1854. Кн. 2. Половина вторая. Отд. 5. С. I – VIII, 1 – 78; 2) Вестник Юго-Западной и Западной России. Т. III. Февраль 1864. С. 23 – 30; Март 1864. С. 39 – 50.

3. Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. Отрывки 1 – 10 // Мемуары, относящиеся до истории Южной Руси. Киев, 1890. Вып. 1: XVI в. С. 6 – 58.

4. Lietuvis Mykolas. Apie totorių, lietuvių ir maskvėnų papročius: Dešimt įvairaus istorinio turinio fragment. Vilnius, 1966.

5. Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. М, 1994.

6. Юргинис Ю. М. Посольство Михаила Литвина у Крымского хана в 1538 – 1540 гг.// Россия, Польша и Причерноморье в XV – XVIII вв. М., 1979. С. 87 – 96.

7. Антонович В. Б. Извлечения из сочинения Михайлы Литвина// Мемуары, относящиеся до истории Южной Руси. Киев, 1890. Вып. 1: XVI в. С. 1 – 6.

8. Любавский М. К. Кто был Михайло Литвин, написавший в первой половине XVI в. трактат «О нравах татар, литовцев и москвитян»// Российская ассоциация научно-исследовательских институтов общественных наук: Ученые записки Института истории. 1929. Т. IV. С. 49 – 54.

9. Лаппо И. И. Литовский статут 1588 г. Каунас, 1936. Т. 1: Исследование, ч. 2.

10. Дмитриев М. В. Михалон Литвин и его трактат// Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. М, 1994. С. 6 – 56.

11. Сокол С. Ф. Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во второй половине XVI в. Минск, 1974.

Библиотека БГУИР

12. Сокол С. Ф. Идеи гуманизма в мировоззрении Михайло Тышкевича// Проблемы общественных наук: Материалы XIII конференции молодых ученых Белоруссии. Минск, 1970.

13. Охманьский Е. Михалон Литвин и его трактат «О нравах татар, литовцев и москвитян» середины XVI в.// Россия, Польша и Причерноморье в XV – XVIII вв. М., 1979. С. 97 – 117.

Библиотека БГУИР

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС ДЛЯ МІЖНАРОДНЫХ БАЗ ДАДЗЕНЫХ

1. Michalonis Lituani De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum fragmina X multiplici historia referta et Johannis Lasicii Poloni De diis samagitarum, caeterorumque sarmatarum et falsorum christianorum. Item de religione armeriorum et de initio regiminis Stephani Batorii. Nunc primum per I. Jac. Grasserum, C. P. ex manuscript authentice edita. Basilieae apud Conradum Waldkirchium, MDCXV. P. 1 – 41.

2. Lytvyn M. Ten fragments of various historical content (of works) Michalon Lytvyn «About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan». 1) *Arhiv istoriko-yuridicheskih svedenij, otnosyashchihsya do Rossii, izdavayemyj N. Kalachovym*. Moskow, 1854. Book 2. The second half. Otd. 5. P. I – VIII, 1 – 78; 2) *Vestnik Yugo-Zapadnoj i Zapadnoj Rossii*. Vol. III. Fevral' 1864. P. 23 – 30; Mart 1864. P. 39 – 50 (in Russ.).

3. Lytvyn M. About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan. Fragments 1 – 10. *Memuary, otnosyashchiesya do istorii Yuzhnoj Rusi*. Кiev, 1890. Vyp. 1: XVI century. P. 6 – 58 (in Russ.).

4. Lietuvis Mykolas. *The Tatar, Lithuanian and Muscovite usages: Ten different historical content fragment*. Vilnius, 1966 (in Lithuan.).

5. Lytvyn M. *About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan*. Moskow, 1994 (in Russ.).

6. Yurginis Y. M. Mikhail Lytvyn Embassy in the Crimean Khan in 1538 - 1540 years. *Rossiya, Pol'sha i Prichernomor'ye v XV – XVIII vv*. Moskow, 1979. P. 87 – 96 (in Russ.).

7. Antonovich V. B. Extract from the writings of Mikhail Lytvyn. *Memuary, otnosyashchiesya do istorii Yuzhnoj Rusi*. Кiev, 1890. Vyp. 1: XVI century. P. 1 – 6 (in Russ.).

8. Lyubavskij M. К. Who was Mykhailo Lytvyn, who wrote in the first half of the XVI century treatise «About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan»// *Rossijskaya associaciya nauchno-issledovatel'skih institutov obshchestvennyh nauk: Uchenyye zapiski Instituta istorii*. 1929. Т. IV. P. 49 – 54 (in Russ.).

9. Lappo I. I. *Lithuanian Statute 1588 г*. Каunas, 1936. Т. 1: Research, ch. 2 (in Russ.).

10. Dmitriyev M. V. Michalon Lytvyn and his treatise // Lytvyn M. *About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan*. Moskow, 1994 (in Russ.).

Библиотека БГУИР

11. Sokol S. F. *Sociological and political thought in Belarus in the second half of the XVI century*. Minsk, 1974 (in Russ.).

12. Sokol S. F. The ideas of humanism in the worldview of Michael Tyszkiewich// *Problemy obshchestvennyh nauk: Materialy XIII konferencii molodyh uchenyh Belorussii*. Minsk, 1970 (in Russ.).

13. Ohman'skij J. Michalon Lytvyn and his treatise «About morals of Tatars, Lithuanians and Moscvityan» the middle of the XVI century. *Rossiya, Pol'sha i Prichernomor'ye v XV – XVIII vv*. Moskow, 1979. P. 97 – 117 (in Russ.).

Библиотека БГУИР